**Да ўвагі адказных за прысвячэння Расіі і Украіны Беззаганнаму Сэрцу Марыі ва ўрачыстасць Звеставання Пана**
***25 сакавіка 2022 г.***

Вашы Эксцэленцыі,
Глыбокапаважаныя Душпастыры,
Шаноўныя Кансэкраваныя асобы!

Па даручэнні Старшыні Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі біскупа Віцебскага Алега Буткевіча, дасылаю Вам прапанаваны план набажэнства, які па жаданні, можна выкарыстаць 25 сакавіка падчас адарацыі Найсвяцейшага Сакрамэнту і Чыну прысвячэння Расіі і Украіны Беззаганнаму Сэрцу Марыі ва ўрачыстасць Звеставання Пана.

Калі цэлебруецца св. Імша вечарам, то пасля яе заканчэння варта правесці адмысловае набажэнства з выстаўленнем Найсвяцейшага Сакрамэнту, падчас якога належыць здзейсніць Чын прысвячэння з Божым народам не змяняючы яго зместу, выразна і не спяшаючыся.

Там жа, дзе не цэлебруецца св. Імша, а таксама ў манаскіх супольнасцях, заахвочваем правесці адарацыю Найсвяцейшага Сакрамэнту, падчас якой здзейсніць Чын прысвячэння.

З благаслаўленнем,

*Біскуп Аляксандр Яшэўскі SDB*
Старшыня Камісіі па справах каталіцкай адукацыі і катэхезы пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

**Набажэнства прысвячэння Расіі і Украіны Беззаганнаму Сэрцу Марыі ва ўрачыстасць Звеставання Пана**
***25 сакавіка 2022 г.***

**Спеў на выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту**

**Уступ**

Пане Езу Хрыстэ, Ты з любові да людзей, дзень і ноч прабываеш у Найсвяцейшым Сакрамэнце. Часы, у якія мы жывём, ставяць перад намі складаныя выклікі. Мы хочам пераҗыць іх, захоўваючы вернасць Табе, нашаму Збавіцелю і Пану. Таму, у лучнасці з Папам Францішкам, усімі біскупамі, прэзбітэрамі, манаскімі асобамі і вернікамі ўсяго свету мы прыйшлі да Цябе, каб ва ўрачыстасць Звеставання Пана маліцца за мір і прысвяціць Расію, Украіну і ўвесь свет Беззаганнаму Сэрцу Марыі.

О Марыя, Беззаганная Панна, якая стала Святыняю Бога, Маці ўсіх жывых, Брамаю збаўленых, Каралеваю супакою і прытулкам грэшнікаў. Будзь для нас Маці і Пуцяводнаю Зоркай, каб, наследуючы Твой прыклад, мы пазбягалі ўсялякага маральнага бруду, жылі ў сяброўстве з Богам і людзьмі і станавіліся прыкладам сапраўднага і праведнага хрысціянскага жыцця.

Схілім галовы перад нашым Панам, укрытым у таямніцы Найсвяцейшага Сакрамэнту. Няхай усе сэрцы адкрыюцца на прысутнасць Бога. Паўтарайма словы малітвы Анёла з Фацімы:

**Малітва Анёла з Фацімы**

О Божа мой, веру ў Цябе, праслаўляю Цябе, давяраю Табе і люблю Цябе.

Прашу ў Цябе прабачэння для тых, хто не верыць у Цябе, не праслаўляе Цябе, не давярае Табе і не любіць Цябе.

О Найсвяцейшая Тройца — Айцец, Сын і Дух Святы!

З глыбокаю пакораю хвалу Табе аддаю і ахвярую Табе Найсвяцейшае Цела і Кроў, Душу і Боскасць Пана нашага, Езуса Хрыста, прысутнага на ўсіх

алтарах свету, як перапрашэнне за знявагі, святатацтва і абыякавасць, якімі Яго абражаюць.

Праз бясконцыя заслугі Яго Найсвяцейшага Сэрца і праз заступніцтва Беззаганнага Сэрца Марыі прашу ў Цябе ласкі навяртання бедных грэшнікаў. Праз Хрыста, Пана нашага. Амэн.

**Спеў да Маці Божай Фацімскай -** З далёкай Фацімы

З далёкай Фацімы даносіцца звон,
З'яўленне Марыі для нас весціць ён.
*Ave, Ave, Ave Maria.*
*Ave, Ave, Ave Maria.*
Дык пойдзем за Маці праз свет поўны слёз,
Каб скласці на рукі Марыі наш лёс.
*Ave, Ave, Ave...*
Цудоўная Пані нязвыклай красы,
Ружанец трымае, бы кроплі расы.
*Ave, Ave, Ave...*
З пяшчотнай усмешкай прад дзецьмі стаіць,
А сэрца святое за грэшных баліць.
*Ave, Ave, Ave...*
Пытаюцца дзеці: «Адкуль, Пані, Ты?»
- Прыходжу я з неба, каб нішчыць грэх злы.
*Ave, Ave, Ave...*
Мы хочам паслухаць Тваіх, Маці, слоў,
Каб Бог нас любіў, як сапраўдных сыноў.
*Ave, Ave, Ave...*
Малітвы і просьбы да Пана нясём,
І душы ачысцім пакуты агнём.
*Ave, Ave, Ave...*
А крыж і цярпенні мы прымем за тых,
Чый грэх лёг слязамі на вочах Тваіх.
*Ave, Ave, Ave...*
Ружанец, пакута - ратунак для нас,
У долі нялёгкай і ў смяротны час.

*Ave, Ave, Ave...*

### Малітва перапрашэння

О праслаўлёная Дзева Марыя, Маці Бога і Маці наша! Узглянь з любоўю на нас, бедных грэшнікаў, якія ў розных пакутах і перажываннях вымушаны выслухоўваць абразы і знявагі супраць Твайго Беззаганнага Сэрца. О, як гэтыя бязбожныя выпады абражаюць Цябе, Беззаганная Панна, адначасова зневажаючы бясконцую веліч Айца і Адзінароднага Яго Сына Езуса Хрыста. Яны змушаюць Найвышэйшую Справядлівасць да гневу і суровай кары.

Нягледзячы на ўласную мізэрнасць і бездапаможнасць, мы хочам зрабіць усё, каб спыніць гэтыя знявагі і блюзнерствы. О наша Найсвяцейшая Маці, мы прагнем ушаноўваць Цябе і ўсім сэрцам любіць, бо гэтага чакае ад нас Бог. І менавіта таму, што мы Цябе любім, мы зробім усё, што толькі зможам, каб усе Цябе ўшаноўвалі і любілі.

О Наймілейшая наша Маці, Прытулак грэшнікаў, прымі гэтае перапрашэнне ад нас і ад нашых супольнасцяў. Прымі яго таксама як перапрашэнне за тых, хто, не ўсведамляючы, што чыніць і што гаворыць, бязбожна абражае Цябе. Выпрасі для іх у Бога ласку навяртання, каб праз удзеленую ім ласку яшчэ больш выявілася Твая Мацярынская дабрыня, моц і міласэрнасць. Няхай і яны далучацца да гэтай пашаны і разам з намі праслаўляюць Тваю святасць і дабрыню, абвяшчаючы, што Ты — благаслаўлёная між жанчынамі, Каралева паннаў, Маці Бога, Беззаганнае Сэрца якой не стамляецца ў чулай любові да кожнага чалавека.

Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі! Амэн.

### Літанія да Беззаганнага Сэрца Марыі

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон.*
Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас.*

Ойча з неба, Божа, – *змілуйся над намі.*
Сыне, Адкупіцель свету, Божа,
Духу Святы, Божа,
Святая Тройца, адзіны Божа, – *змілуйся над намі.*

Сэрца Марыі, пры зачацці грэхам не закранутае, – *маліся за нас.*
Сэрца Марыі, ласкі поўнае,
Сэрца Марыі, з Сэрцам Езуса найбліжэй з’яднанае,
Сэрца Марыі, благаслаўлёнае між усімі сэрцамі,
Сэрца Марыі, найчысцейшае,
Сэрца Марыі, найпакорнейшае,
Сэрца Марыі, наймілейшае,
Сэрца Марыі, годная Святыня Найсвяцейшай Тройцы,
Сэрца Марыі, Святыня Бога ўцелаўлёнага,
Сэрца Марыі, ад грэху першароднага захаванае,
Сэрца Марыі, у адведзінах новымі ласкамі ўпрыгожанае,
Сэрца Марыі, пры нараджэнні Хрыста дзівоснай радасцю напоўненае,
Сэрца Марыі, пры ахвяраванні мечам балесці пранізанае,
Сэрца Марыі, пры знаходжанні Езуса вельмі ўзрадаванае,
Сэрца Марыі, з Езусам самотным у садзе Аліўным жальбаю ахопленае,
Сэрца Марыі, пры бічаванні Хрыста страшна змучанае,
Сэрца Марыі, пры ўкаранаванні Хрыста цернямі пакуты прабітае,
Сэрца Марыі, пры нясенні крыжа Хрыстом спачуваннем ахопленае,
Сэрца Марыі, дасканалая ахвяра Божай Любові,
Сэрца Марыі, з Езусам да крыжа прыбітае,
Сэрца Марыі, разам з Езусам церпячае,
Сэрца Марыі, з памерлым Езусам у смутку пахаванае,
Сэрца Марыі, з уваскрослым Езусам радасцю ажыўленае,
Сэрца Марыі, пры ўнебаўшэсці Езуса радасцю напоўненае,
Сэрца Марыі, пры спасланні Духа Святога зноў асвячанае,
Сэрца Марыі, пры ўнебаўзяцці над усімі святымі ўзвышанае,
Сэрца Марыі, суцяшэнне засмучаных,
Сэрца Марыі, прытулак і надзея грэшнікаў,
Сэрца Марыі, надзея паміраючых,
Сэрца Марыі, трон міласэрнасці, – *маліся за нас.*
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *даруй нам, Пане.*
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *выслухай нас, Пане.*
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *змілуйся над намі.*

С.: Марыя Беззаганная, ціхая і пакорная сэрцам.
Н.: Учыні сэрцы нашыя падобнымі да Сэрца Пана Езуса.

Молімся: Божа дабрыні, які дзеля збаўлення грэшнікаў і дзеля дапамогі ўбогім пажадаў, каб Сэрца Панны Марыі праз сваю любоў і міласэрнасць было падобным да Божага Сэрца Езуса Хрыста, Твайго Сына; учыні, каб мы, аддаючы пашану Яе найцудоўнейшаму Сэрцу, праз Яе заслугі і заступніцтва заслужылі мець сэрца, падобнае да Сэрца Езуса. Які жыве і валадарыць на векі вечныя. Амэн.

**Чын прысвячэння Беззаганнаму Сэрцу Марыі Папы Францішка**

О Марыя, Маці Бога і наша Маці, мы звяртаемся да Цябе ў гэты неспакойны час. Ты — Маці, любіш і ведаеш нас: у нашых сэрцах няма нічога схаванага ад Цябе. Маці Міласэрнасці, мы часта спазнавалі Тваю прадбачлівую пяшчоту, Тваю прысутнасць, якая вяртае супакой, бо Ты заўсёды вядзеш нас да Езуса, Валадара супакою.

Але мы згубілі шлях супакою. Мы забыліся ўрок трагедый мінулага стагоддзя, ахвяру мільёнаў загінулых у сусветных войнах. Мы пагардзілі абавязацельствамі, узятымі на сябе супольнасцю народаў, здраджваем марам народаў аб міры і спадзяванням моладзі. Мы захварэлі прагнасцю, замкнуліся ў нацыяналістычных інтарэсах, дазволілі, каб абыякавасць зрабіла нас чэрствымі, а эгаізм — паралізаваў. Мы аддалі перавагу ігнараванню Бога, суіснаванню са сваёй маной, умацаванню агрэсіўнасці, прыгнёту людзей і назапашванню ўзбраенняў, забываючыся пра тое, што з’яўляемся ахоўнікамі нашага бліжняга і нашага агульнага дома. Мы спустошылі вайной сад Зямлі, мы паранілі грахом сэрца нашага Айца, які хоча, каб мы былі братамі і сёстрамі. Мы сталі абыякавымі да ўсіх і ўсяго, акрамя саміх сябе, і з сорамам кажам: прабач нам, Пане!

У мізэрнасці граху, у нашых цяжкасцях і кволасці, у таямніцы бруду зла і вайны, Ты, Найсвяцейшая Маці, нагадваеш нам, што Бог не пакідае нас і працягвае глядзець на нас з любоўю, прагнучы прабачыць і ўзняць нас. Гэта Ён падараваў нам Цябе і зрабіў Тваё Беззаганнае Сэрца прытулкам для

Касцёла і чалавецтва. Дзякуючы Боскай дабрыні Ты — разам з намі і вядзеш нас з пяшчотай нават на самых крутых паваротах гісторыі.

Таму звяртаемся да Цябе, грукаем у дзверы Твайго Сэрца, мы, дарагія Табе дзеці, якіх Ты ніколі не стамляешся наведваць і запрашаць да навяртання. У гэты цёмны час прыйдзі падтрымаць і суцешыць нас. Паўтары кожнаму з нас: «Ці не тут я, твая Маці?» Ты ведаеш, як разблытаць клубкі нашых сэрцаў і вузлы нашага часу. Мы зноў ускладаем наш давер на Цябе. Мы ўпэўненыя, што Ты, асабліва ў хвіліну выпрабаванняў, не пагардзіш нашымі малітвамі і прыйдзеш нам на дапамогу.

Ты зрабіла так у Кане Галілейскай, паскорыла гадзіну ўмяшання Езуса і ўнесла ў свет Яго першы знак. Калі свята змянілася ў смутак, Ты сказала Яму: «Не маюць віна» (Ян 2, 3). Зноў скажы гэта Богу, о Маці, бо сёння ў нас скончылася віно надзеі, знікла радасць, стала разбаўленым братэрства. Мы згубілі чалавечнасць, мы страцілі супакой. Мы сталі здольнымі на рознага роду насілле і разбурэнне. Нам неадкладна патрэбна Тваё мацярынскае ўмяшанне.

Таму прымі, о, Маці, гэту нашу малітву.

Ты, Зорка мора, не дазволь нам патануць у буры вайны.

Ты, Каўчэг Новага Запавету, натхні задумы і шляхі прымірэння.

Ты, «Нябесная зямля», вярні Божую згоду ў свет.

Пагасі нянавісць, суціш помсту, навучы прабачэнню.

Вызвалі нас ад вайны, захавай свет ад ядзернай пагрозы.

Каралева Ружанца, абудзі ў нас патрэбу маліцца і любіць.

Каралева чалавечай сям’і, пакажы народам шлях братэрства.

Каралева супакою, прынясі ў свет супакой.

Няхай Твой плач, о Маці, узрушыць нашыя закамянелыя сэрцы. Няхай слёзы, якія Ты праліла за нас, дапамогуць расквітнець гэтай даліне, высушанай нашай нянавісцю. І няхай, пакуль яшчэ не змоўк грукат зброі, Твая малітва

схіліць нас да міру. Няхай Твае матчыны рукі атуляць усіх, хто пакутуе і ўцякае пад цяжарам бомб. Няхай Твае матчыны абдымкі суцешаць усіх, вымушаных пакінуць свае дамы і сваю краіну. Няхай Тваё балеснае Сэрца скіруе нас да спагады і падштурхне адкрыць дзверы і клапаціцца пра параненае і адчужанае чалавецтва.

Найсвяцейшая Багародзіца, калі Ты стаяла пад крыжам, Езус, убачыўшы вучня побач з Табой, сказаў Табе: «Вось сын Твой» (Ян 19, 26): так Ён даверыў Табе кожнага з нас. Потым Ён сказаў вучню, кожнаму з нас: «Вось Маці твая» (27). Маці, цяпер мы прагнем прыняць Цябе ў наша жыццё і нашу гісторыю. У гэты час чалавецтва, знясіленае і збянтэжанае, стаіць пад крыжам разам з Табой. І мае патрэбу ў тым, каб даверыцца Табе, прысвяціць сябе Хрысту праз Цябе. Народы Украіны і Расіі, якія ўшаноўваюць Цябе з любоўю, звяртаюцца да Цябе, у той час як Тваё Сэрца б’ецца за іх і за ўсе народы, параненыя вайной, голадам, несправядлівасцю і галечай.

Таму мы, Маці Бога і наша Маці, урачыста давяраем і прысвячаем Твайму Беззаганнаму Сэрцу нас саміх, Касцёл і ўсё чалавецтва, асаблівым чынам Расію і Украіну. Прымі гэты наш чын, які здзяйсняем з даверам і любоўю; зрабі так, каб спынілася вайна, адары свет супакоем. Няхай «так», якое выйшла з Твайго Сэрца, адкрые дзверы гісторыі перад Валадаром супакою; мы верым, што зноў праз Тваё Сэрца прыйдзе мір. Таму прысвячаем Табе будучыню ўсёй чалавечай сям’і, патрэбы і чаканні народаў, трывогі і надзеі свету.

Няхай праз Цябе выльецца на Зямлю Божая Міласэрнасць і салодкі рытм супакою зноў будзе пазначаць нашыя дні. Жанчына «так», на якую сышоў Дух Святы, аднаві гармонію паміж намі і Богам. Ты, якая з’яўляешся «жывой крыніцай надзеі», наталі вільгаццю чэрствасць нашага сэрца. Ты саткала чалавецтва Езусу, зрабі нас рамеснікамі адзінства. Ты прайшла нашымі шляхамі, вядзі нас па сцежках супакою. Амэн.

**Спеў Суплікацыі**

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, змілуйся над намі!
(*Паўтараецца тройчы.*)
Ад пажару, голаду, вайны і заразы,

*– барані нас, Божа!*
Ад раптоўнай і неспадзяванай смерці,
*– сцеражы нас, Божа!*
Каб Касцёл свой святы каталіцкі
бараніць і ўзвышаць меў ласку,
*– Цябе просім, Божа!*
Каб Айца Святога і ўсе духоўныя станы
ў пабожнай еднасці захаваць меў ласку,
*– Цябе просім, Божа!*
Каб нас у святой службе Тваёй
умацаваць меў ласку,
*– Цябе просім, Божа!*
Каб нас да шчырага пакаяння
давесці меў ласку,
*– Цябе просім, Божа!*
Каб ураджай даць
і захаваць яго меў ласку,
*– Цябе просім, Божа!*
Мы, грэшныя, Цябе, Бога, просім,
*– выслухай нас, Божа!*
О, Езу, Езу, Езу,
*– змілуйся над намі!*
О, Марыя, Панна і Маці Божая,
– заступіся за нас!

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, змілуйся над намі!
(Паўтараецца тройчы.)

**Спеў на заканчэнне выстаўлення Найсвяцейшага Сакрамэнту**

**Благаслаўленне Найсвяцейшым Сакарамэнтам**

**Спеў на завяршэнне набажэнства**

*Ты за нас цярпеў ад ранаў, Езу Хрыстэ, змілуйся над намі!*